**А. Голас**

# НАЦЫСЦКІЯ КАНЦЛАГЕРЫ ВА ЎСПАМІНАХ ВЯЗНЯ

Вялікая Айчынная вайна – гэта вельмі складаная тэма, якая, як самая вялікая трагедыя XX стагоддзя, актыўна разглядаецца з розных бакоў, але ж пры гэтым захоўвае вялікую колькасць пытанняў без адказаў і белых плям у сваёй гісторыі. Шмат і невядомых імён тых ахвяр, якія пад час вайны знаходзіліся на крок ад смерці. Гэтыя людзі – былыя вязні канцлагераў. Пра жудасныя гадзіны знаходжання ў месцах смерці аднаго з іх мне хочацца паведаць…

20 мая 1943 г. з маленькага гарпасёлка Урэчча была вывезена сям'я Балвановічаў: бацька Леанід, матуля Францыя, дзеці: Мечык, Генрых, Ларыса і маленькі Ігар, якому тады было толькі 3 гады і ўспаміны якога ляглі ў гэтыя радкі. Пасля знаходжання ў Слуцкай турме іх усіх пагрузілі ў эшалон на Польшчу ў лагер-размеркавальнік, адкуль членаў гэтай сям'і раскідалі па розных месцах: бацьку адправілі на прымусовую працу ў Германію, матулю разам з Ігарам у адзін лагер, астатніх дзяцей – у іншыя. У памяці Ігара Леанідавіча засталіся шматлікія карціны, апісанне якіх, нават праз столькі гадоў, яму давалася са значнай складанасцю. Перад яго дзіцячымі вачыма ўзнікалі душагубкі, у якіх перавозілі вязняў у наступнае месца, да якога не ўсе даязджалі жывыя: шмат людзей задыхалася ад выхлапнога газу па дарозе. Ён бачыў, як нацысты выгружалі пласт дроў, і пласт трупаў з гэтых машын, палівалі нейкай вадкасцю, запальвалі, а як усё згарала, вывозілі на поле ў якасці ўгнаення. Самым вялікім жахам яго дзяцінства сталі морды аўчарак, іх злосны аскал. Яны кідаліся, ірвалі чалавека – адбывалася гэта ўсё перад маленькім Ігарам. Ён памятае, як ужо ў самым лагеры кожнаму вязню адводзілася «норка» ў бараку, як іх кармілі рэдзькай і вадой, як усіх гналі ў пятніцу ў «лазню», да якой вёў калідор, дзе на нахабных умовах камісіяй вырашаўся чалавечы лёс: калі чалавек быў слабы, яго адпраўлялі направа, у крэматорый, а калі яшчэ трымаўся на нагах, то налева, у сапраўдную лазню. Ігара Леанідавіча, які быў вельмі слабы з-за жорсткай формы дыстрафіі, выратавала ад жудаснага канца смеласць і добрае веданне нямецкай мовы яго матуляй. І яшчэ адной кропляй дабрыні, акрамя ўчынкаў маці, у гэтых лагерах смяротнай жорсткасці і злобы стала дапамога французаў. Калі маці падносіла Ігара да калючага дроту, яны перакідвалі ўсё, што ім пастаўляў французскі Чырвоны крыж і так ратавалі жыццё маленькага хлапчука.

Я вельмі спадзяюся, што вось праз такія малюнкі з жыцця былых вязняў, ахвяр вайны, знікнуць у гісторыі белыя плямы і створыцца сапраўдны вобраз вайны, які пакажа, што гэтыя страшэнныя падзеі не абстрактныя, кшталту «гэта здарылася даўно і не са мною», а за імі стаяць лёсы рэальных, жывых людзей. Пра гэта лягчэй не ведаць, але не ведаць пра гэта нельга і не магчыма.